УДК 821.161.3.09

Вуч. П.А. Машчанка
Навук. кір. Г.І. Даміно, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА "Гімназія №38 г. Мінска")

# ПЕРСАНІФІКАЦЫЯ Ў ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫХ ТВОРАХ У. КАРАТКЕВІЧА

У. Караткевіч плённа працаваў у жанры эсэ, надрукаваў шмат артыкулаў. Яго нарыс "Зямля пад белымі крыламі" называюць энцыклапедыяй Беларусі.

Вялікай каштоўнасцю з'яўляюцца эсэ У.Караткевіча. І сёння яго мова, стыль, форма застаюцца прыкладам сапраўднага майстэрства. У сваіх публіцыстычных творах У. Караткевіч выкарыстоўвае шмат тропаў, сярод якіх і метафары, і цудоўныя, нават паэтычныя параўнанні. Асаблівае месца сярод выкарыстаных мастацккіх прыёмаў займае ***персаніфікацыя***, да якой У. Караткевіч прыбягае як у публіцыстыцы, так і ў мастацкіх творах.

У сваім даследаванні мы паставілі перад сабой галоўную мэту: прааналізаваць выкарыстанне персаніфікацыі ў публіцыстыцы Уладзіміра Караткевіча.

У кантэксце нашага даследавання персаніфікацыя разглядаецца як троп, які паведамляе пэўныя прыкметы, напрыклад, прыкметы жывых істот (актыўнасць, наяўнасць волі, элементы жывёльнага аблічча), прыкметы чалавека (актыўнасць, мова, розум, пачуцці, імя, рытуальна – сацыяльныя паводзіны), асобасныя прыкметы (распазнаванне дабра і зла, характар, маральна афарбаваныя ўчынкі).

Найбольш часта да *персаніфікацыі* У. Караткевіч прыбягае ў апісанні наваколля. Атаясамленне чалавечага і навакольнага паказваюць глыбіню ўспрымання света аўтарам. Жывёлы, рэкі, паветра – усё гэта нібы жыве сваім жыццём так, як і людзі.

Шматлікія прыклады можна з лёгкасцю знайсці ў асобных частках нарыса *"Зямля пад белымі крыламі"*.

Разгледзім некаторыя з момантаў ужывання персаніфікацыі ў адносінах да наваколля.

У частцы "Зялёны шум" Караткевіч разважае пра жыццё нашых запаведнікаў і пушчаў. Побач з лічбамі, апісаннямі флоры і фаўны, Караткевіч прыбягае да персаніфікацыі ў размове пра Белавежскую пушчу. Аўтар піша:

*"Пушча аглухла ад стрэлаў. Хрыпелі праз кроў дзікі, біліся ў сутарагах алені і рахманыя даніэлі, цяжка валіліся на зямлю і моўчкі*

*памiралi зубры (зубр заўсёды памiрае моўчкi, не прынiжае сябе нават у смяротны час, трымаецца гонару). I так вось Пушча змоўкла i сцiшылася перад тым, як зрабiцца нямой Пушчай".* [1, с.54]

Звернем увагу да першага сказа. У якасцi персанiфiкацыi гучаць словы "пушча аглухла". Сапраўды, пушча не з'яўляецца жывой iстотай i аглухнуць не можа. Тым не менш, калi Караткевiч працягвае апiсваць жывёл, разумее, што для яго пушча – гэта таксама нешта жывое. Тое, што таксама можа адчуваць боль. Заканчваецца абзац таксама персанiфiкацыяй "пушча змоўкла i сцiшылася". Перад чытачом паўстае вобраз не проста лесу i жывёл, а сапраўдная Пушча-змагарка, Пушча-мацi, якая паводзiць сябе як чалавек.

Да зямлi ў У. Караткевiча таксама адносiны, як да жывога. У частцы "Людзi зямлi беларускай" гучаць словы не толькi пра якасцi людзей, але i пра ўплыў зямлi на характар беларусаў:

*"Тая самая шчодрая зямля прывучыла калiсьцi беларуса да разлiку ў вядзеннi гаспадаркi, да ашчаднасцi, да таго, што нiшто не прападае, усё iдзе ў справу, нават падабраны цвiк, нават лясiна цi калода, прыплаўленая ракой, i, аднак, дужа памылiўся б той, хто назваў бы яго скупым".* [1, с.54]

Сапраўды, прыём персанiфiкацыi робiць у нашых вачах зямлю не проста каштоўнасцю, нават не проста "жывой", а той, якая ўплывае на чалавека. У. Караткевiч нiбы падкрэслiвае, што ад зямлi мы бяром не толькi ежу, а яна i выхоўвае нас.

У далейшым У. Караткевiч працягвае параўноўваць зямлю з чалавекам, надаваць ёй чалавечыя рысы, характар. У частцы "За рэчкаю, за быстраю азярцо мiльгнула" чытаем: "*Лес кормiць, лес грэе i дровамi, i сценамi хат, i проста так, лес баронiць у выпадку небяспекi, нашэсця, вайны*". [1, с. 60]

Персанiфiкацыя "*кормiць, грэе, баронiць*" стварае вобраз жывой iстоты. Нават мацнейшай за чалавека, але з чалавечымi якасцямi.

У "Зямлi пад белымi крыламi" гарадам Беларусi прысвечаны цэлы раздзел пад назвай "Камянiцы, i гмахi, i вежы". Зразумела, што ў аповедах пра прыгажэйшыя беларускiя гарады, У. Караткевiч таксама выкарыстоўвае персанiфiкацыю. У горада, як i ў яго жыхароў, таксама ёсць сваё жыццё.

Першым iдзе аповед пра сталiцу Беларусi – Мiнск. Побач з апiсаннем прыгожых вулiц i праспектаў, багаццяў Мiнска i вобласцi, таiць успамiн пра крывавае мiнулае ў гiсторыi нашага горада. Сапраўды, складана ўявiць сабе апiсанне Мiнска без успамiнаў пра Вялiкую Айчынную вайну:

*“Мінск у вайну змагаўся гераічна. Мінск гераічна ўставаў пасля вайны з попелу. Гораду-герою належыць быць прыўкрасным. І ён прыўкрасны. У кожны час дня і ночы, у кожную пару года. А будзе яшчэ лепшы. І на гэтым пакуль скончым пра Мінск”.* [1, с.79]

Дзякуючы персаніфікацыі “змагаўся, уставаў з попелу” мы ўяўляем мінулае нашага горада нібы на здымках. Сапраўды, так лаканічна, але з вялікімі пачуццямі ўспамінае Караткевіч пра вайну. З дапамогай персаніфікацыі мы ўяўляем, што не толькі людзі, а нібы сам горад змагаўся за сваю будучыню. Ці не сапраўдны герой?

У кожным горадзе знаходзіць У. Караткевіч асабістыя цуды. І ўсе яны нібы жывыя. Нават самі будынкі ў гарадах таксама маюць пачуцці. Зусім, як людзі. Возьмем прыклад з апісання Гомельскай вобласці:

*“Плывеш, а зялёныя гарадкі і вёскі ўтульна ляжаць на берагах, глядзяцца ў ваду дужа даўнія, шматвяковыя палацы, храмы і белыя альтанкі. <...>. Ганчарныя вёскі, дзе робяць дасканалы посуд і да гэтага напаўжартам гавораць: “Наша прохвесія самая старая”.* [1, с. 89]

Персаніфікацыя дазваляе Караткевічу перадаць настрой аб’ектаў, якія нерухомы ў жыцці. Канешне, можна было замяніць дзеяслоў “глядзяцца” на “адлюстроўваюцца”. Тады ўсё было б рэальна апісана. Але ці падобна гэта на мову паэта? Сапраўды, тое, што нашы вочы не бачаць, але адчувае сэрца, паэтам можа быць перанесена ў словы. Не з кожным стане размаўляць вёска. Але пры дапамозе персаніфікацыі У. Караткевіч ажыўляе яе для нас, нават укладвае ў яе вусны пэўныя словы. Атрымліваецца жывы малюнак, напоўнены дзеяннямі там, дзе ўсё статычна.

Так, прааналізаваўшы некалькі публіцыстычных твораў з “Зямлі пад крыламі” можна зрабіць шэраг высноў пра выкарыстанне персаніфікацыі:

1) прыём дазваляе прыдаць твору больш дынамікі. Гэта асабліва важна, калі апісваецца флора і фаўна;

2) персаніфікацыя выкарыстоўваецца і для апісання статычных аб’ектаў: будынкаў, вёсак і інш. Гэта надае ім больш паэтычнасці, цікавасці для чытача;

3) каб прыдаць не толькі дынаміку, а яшчэ і насычанасць гукамі, У. Караткевіч выкарыстоўвае персаніфікацыю ў адносінах да аб’ектаў паўсядзённых. Гэта дазваляе кожнаму ўявіць гук, які раней ніколі не чуў;

4) усе выпадкі, калі У. Караткевіч выкарыстоўвае персаніфікацыю, накіраваны на разуменне чытача цеснай сувязі чалавека і наваколля, нерухомасці гэтай сувязі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Караткевіч, У. Зямля пад белымі крыламі / У. Караткевіч. - Мінск. : "Народная асвета", 1992. – 191 с.



УДК 821.161.3:398.332.2



Вуч. Д.А. Мекта

Навук. кір. Н.А. Жураўлевіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры

(ДУА "Сярэдняя школа № 1 г. Светлагорска")


## КУПАЛЛЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У апошні час і прэса, і народ праяўляюць павышаную цікавасць да фальклору, народных звычаяў і абрадаў, да паходжання рэлігійных вераванняў.

У беларускай вуснай народнай паэзіі група купальскіх святаў з'яўляецца адной з самых багатых па архаічных матывах, па сімволіцы, па разнастайнасці мелодыкі, таму прадметам маёй працы стала **Купалле.**

Купалле вядома ўсім народам Еўропы.

Перад Купаллем дзяўчаты і жанчыны ішлі збіраць васількі, купалінку, папараць і спявалі песні.

Адным з першых, хто звярнуўся ў сваіх творах да абраду Купалля быў Францішак Багушэвіч. У вершаваным апавяданні "Хцівец і скарб на святога Яна" ён пераклаў шырока распаўсюджаныя ў народзе легенды і быліны пра пошук скарбу ў купальскую ноч з дапамогай кветкі-папараці. Па сюжэце верш Ф.Багушэвіча ў многім нагадвае вядомае апавяданне М.Гогаля "Вечар напярэданні Івана Купалы". У аснове абодвух твораў – і страх людскі перад лясным гушчаром з яго насельнікамі ( злымі духамі), і глыбока старажытная вера ў чароўнасць купальскай ночы, і надзея здабыць шчасце з дапамогай кветкі незвычайнай расліны.

Матыў папараці-кветкі як сімвал свабоды, шчасця, духоўнага багацця, валодання таямніцамі прыроды становіцца ад гэтага часу асноўным , скразным у беларускай літаратуры, асабліва ў пачатку XX стагоддзя.

У алегарычнай казцы "Купальскія светлячкі" Якуб Колас праводзіць тую ж патаемную, важнейшую думку, што і Ф. Багушэвіч.